

ЕПІСКАП СЕРАФІМ ПРА ВЕРУ І МОЛАДЗЬ 8

ВЕРШЫ ПРА ВЯЛІКДЗЕНЬ 10



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 МАЯ 2024 г. СУБОТА № 88 (30222)

# Свята сапраўдных каштоўнасцяў

*Праваслаўным хрысціянам Беларусі*

*Дарагія суайчыннікі!*

*Шчыра віншую вас са святам Вялікадня.*

*Яно ўвасабляе трыумф жыцця над смерцю, перамогу дабра над злом, пакоры і самаахвяравання над усёдазволенасцю і эгаізмам. Святло велікодных дзён нагадвае нам пра вечныя евангельскія ідэалы даравання і спагады, любові і клопату пра блізкіх.*

*Разам са Святым Хрыстовым Уваскрэсеннем адраджаецца і прачынаецца вясна, сэрцы вернікаў напаўняюцца гармоніяй і спакоем. Сёння мелодыя званоў Праваслаўнай Царквы сімвалізуе ўрачыстасць на нашай зямлі сапраўдных каштоўнасцяў хрысціянства, якія збліжаюць пакаленні, выступаюць асновай адзінства беларускага народа.*

*Няхай Божая благадаць дакранецца да вашых душ і сагрэе цеплынёй дамы, а сямейныя сустрэчы падораць шчасце і радасць.*

*Жадаю вам міру, згоды і моцнага здароўя.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Пры царкве Пакрова Прасвятой Багародзіцы ў вёсцы Чыжэвічы Салігорскага раёна ўжо не першы год дзейнічае клас званароў. Званар храма Ігар Цемчын навучае свайму майстэрству вучняў гімназіі № 1 Салігорска, якая супрацоўнічае з храмам. Падлеткі з вялікім задавальненнем наведваюць заняткі, удзельнічаюць у фестывалях званароў і святочных богаслужэннях. Пяцікласнік Эльдар ЧОРНЫ займаецца ў класе ўжо чатыры гады і марыць адзваніць велікодны благавест.**

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ГЭТА НЕ ПРОСТА ЎРАЖВАЕ, ГЭТА ПРЫСТОЙНА»

## Прэзідэнт даў станоўчую ацэнку папярэднім вынікам праверкі дзяжурных сіл Ваенна-паветраных сіл і войск супрацьпаветранай абароны



Фота БелТА.

**За ходам праверкі Аляксандр Лукашэнка назіраў на Цэнтральным камандным пункце Ваенна-паветраных сіл і войск супрацьпаветранай абароны.**
**Кіраўнік дзяржавы назіраў за праверкай ад моманту яе пачатку і да самага заканчэння, падрабязна цікавіўся ўсім працэсам, пасля чаго пагутарыў з удзельнікамі мерапрыемства.**

Падводзячы вынікі праверкі, Прэзідэнт адзначыў, што першае пытанне, якое яго хвалявала, каб усё адбывалася аб'ектыўна і сумленна.

«Як ваенны чалавек, магу сказаць, што калі вы праверку арганізавалі сумленна, як гэта належыць, то гэта дастойна, — звяртаючыся да ваеннаслужачых, канстатаваў Галоўнакамандуючы. — Я не служыў у ВПС і ВСА, але бачу, як ажыццяўляецца гэтая праверка, задума яе. Вы выявілі ўсе цэлі, з усімі цэлямі справіліся. Гэта выдатна. Ні адна цэль міма вас не прайшла. Уся Беларусь (гэта відаць у рэжыме рэальнага часу) вамі кантралюецца».

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што падчас праверкі дзяжурных сіл па супрацьпаветранай абароне ўсе цэлі былі выяўлены своечасова. «Вы з імі справіліся: дзе трэба — паразілі, дзе трэба — прымусілі да пасадкі, — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. — Вы бачыце ўсё, што робіцца на сумежжы, разведка працуе добра, інфармацыя перадаецца. Малайцы! Адно толькі — калі гэта ўсё нечакана, раптоўна і сумленна. Гэта не проста ўражвае, гэта прыстойна. Будуць вынікі аб'ектыўнага кантролю, тады мы канчаткова падвядзём вынікі ў Міністэрстве абароны. У мяне адна толькі насцярожанасць — каб гэта было сумленна. Раптоўная праверка — значыць ведаюць тыя, каму трэба, а астатнія працуюць, як у ваенны час. Калі гэта так, то малайцы. Гэта нядрэнна!»

СТАР. 2

ISSN 1990 — 763X

КОРАТКА

• **Аляксандр Лукашэнка павіншаваў работнікаў друку з прафесійным святам — Днём друку.**

• Рэспубліканская акцыя «Іх імёнамі названы студэнцкія атрады» пройдзе 7 мая ў Мінску.

• **Прэм'ерныя паказы дакументальнага фільма «Вызваленне» адбудуцца ў 22 гарадах Беларусі.**

• Да Дня Перамогі 6 і 9 мая «Белпошта» ў выдзеленых аб'ектах паштовай сувязі правядзе акцыю «Адпраў вестку ветэрану».

• **Старадаўні велікодны абрад «Стрылка» правядуць у Драгічынскім раёне.**